# ЗА́МКІ

У гэту тэрыторыю трапляе і наш Свіслацкі раён.

***— Праграма «За́мкі Беларусі» хоць і рэспубліканская, але датычыцца ў большай ступені менавіта вашай вобласці — дзве трэці замкаў, якія захаваліся, знаходзяцца менавіта тут. Як прасоўваецца яе рэалізацыя? І як асабіста вы ставіцеся да дылемы: закансерваваць аўтэнтычныя руіны або зрабіць фактычна сучасны муляж таго, што было калісьці (прынамсі, так гавораць пра Лідскі замак)?***

— Калі казаць пра Лідскі замак... Тут я з вамі не згодны, што лепш было б пакінуць маляўнічыя закансерваваныя руіны. Гальшанскі, Навагрудскі і Крэўскі замкі — гэта сапраўды руіны. А Лідскі, хоць і быў значна разбураны, аднаўленню ўсё ж падлягаў. Сёння там праходзяць найцікавейшыя масавыя мерапрыемствы, перш за ўсё для тых жа турыстаў. А работы на замку працягваюцца — вонкавы выгляд да ладу давялі, цяпер робіцца гістарычны інтэр'ер — у яго вежах ствараюцца экспазіцыі. Шкада, што названыя тры за́мкі, якія ў руінах, нельга так аднавіць. Але зараз выдаткаваныя сродкі на іх кансервацыю.

Увогуле, як я ўжо казаў, тут людзі вельмі трапятліва ставяцца да захавання помнікаў гісторыі. Перш чым прыняць рашэнне аб рэканструкцыі Старога Замка ў Гродне, якая ўжо пачалася, мы год раіліся, у тым ліку і з прадстаўнікамі грамадскасці, гісторыкамі, выслухоўвалі ўсе меркаванні. І ўрэшце прыйшлі да пагаднення: будзем рабіць менавіта так. Добра, што знаходзяцца на гэту важную справу сродкі — і з прэзідэнцкага фонду, і з абласнога бюджэту, і спонсары дапамагаюць. Спадзяюся, што крок за крокам мы прывядзём яго да стану Нясвіжскага і Мірскага замкаў. Несумненна, гэта запатрабуе грошай і часу.

***— У такім выпадку, можа, пусціць на гэту «пляцоўку» прыватную ініцыятыву?***

— Прыватная ініцыятыва магчымая толькі на невялікіх аб'ектах. На вялікіх аб'ектах, акрамя таго, што патрабуюцца вельмі вялікія выдаткі, яшчэ і трэба захоўваць гістарычную аўтэнтыку пад пільным кантролем Міністэрства культуры. Для прыватніка гэта непасільны маштаб. Іншая рэч — аб'екты невялікія, як Любчанскі замак, могуць адраджацца менавіта дзякуючы прыватнай ініцыятыве. Ці, напрыклад, славуты лямус — драўляны дом, пабудаваны ў Гродне без адзінага цвіка некалькі стагоддзяў назад, што знаходзіцца сёння на тэрыторыі каталіцкага кляштара, — яго сёння рэстаўруе каталіцкая царква пры дапамозе польскага інстытута гісторыі. Быў выдзелены грант, работы кансультуюць польскія спецыялісты. І падобныя ініцыятывы таксама вітаюцца, бо гістарычны аб'ект адраджаецца ў нашым горадзе, для нашых людзей, для прыцягнення тых жа турыстаў.

***— Гродзеншчына ўнікальная яшчэ і тым, што тут на зусім невялікай тэрыторыі вякамі жывуць прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў, канфесій — самая вялікая канцэнтрацыя такой разнастайнасці ва ўсёй краіне. А ў той жа недалёкай Еўропе зараз развіваюцца супярэчлівыя, неадназначныя працэсы, у адносінах да мусульман напрыклад. Адгалоскай гэтых працэсаў не чуваць дзе-небудзь у вашай вобласці — скажам, у тым жа Іўі?***

— Не бачу перадумоў да таго, што могуць абвастрыцца адносіны паміж людзьмі ў нашым шматнацыянальным і шматканфесійным рэгіёне. Па-першае, мы дружна жывём ужо не адно стагоддзе. Так склалася гістарычна. Пражываючы на вельмі бойкім месцы, дзе часта ішлі войны, народы, якія насяляюць нашу прынёманскую зямлю, павінны былі аб'ядноўвацца, каб супрацьстаяць шматлікім варожым набегам. Акрамя таго, Гродзеншчына знаходзіцца на стыку ўсходняй і заходняй цывілізацый, і на працягу стагоддзяў тут складваўся міжкультурны дыялог. Гандлёвыя шляхі, якія пралягалі праз Прынёманскі край, спрыялі эканамічнаму развіццю рэгіёна. Людзей розных нацыянальнасцяў аб'ядноўвалі агульныя эканамічныя інтарэсы. Усе былі і сёння застаюцца зацікаўленыя ў стабільнасці.

Тыя ж татары, якія вызнаюць іслам, пражываюць на Гродзеншчыне больш за шэсць стагоддзяў. Гэта ўжо карэнная нацыя, і ярэ рэлігія ў гэтых краях традыцыйная.

Вядома, атмасферу талерантнасці нельга растлумачыць толькі гістарычным вопытам. Справа ў тым, што на Гродзеншчыне, як і ў іншых рэгіёнах нашай краіны, ніхто не адчувае сябе ўшчэмленым па нацыянальнай або рэлігійнай прыкмеце. І ў гэтым вынік нацыянальнай палітыкі беларускай дзяржавы. У аснове кадравай палітыкі ў нашай вобласці заўсёды ляжаў прафесіяналізм, дзелавыя і маральныя якасці людзей і ніяк не нацыянальная або канфесійная прыналежнасць.

Нацыянальным грамадскім аб'яднанням, якія дзейнічаюць на тэрыторыі вобласці, аказваецца падтрымка. Пры правядзенні культурна-масавых мерапрыемстваў у раёнах бязвыплатна выдзяляюцца памяшканні, транспарт для арганізацыі гастрольных паездак мастацкіх самадзейных калектываў. У календары святочных мерапрыемстваў, якія праводзяцца на Гродзеншчыне, нямала такіх, што маюць спрыяць умацаванню дружбы паміж людзьмі розных нацыянальнасцяў.

Самым маштабным, вядома, з'яўляецца Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур. У Беларусі, мабыць, няма месца, якое лепш падыходзіла б для такой маштабнай сяброўскай сустрэчы прадстаўнікоў розных народаў, чым Гродна, бо горад з багатай гісторыяй быў цэнтрам развіцця культур многіх народаў. Гродзенцы любяць гэта свята, чакаюць яго.

Мы ўжо пачалі падрыхтоўку да дванаццатага фестывалю, які адбудзецца ў першых чыслах лiпеня наступнага года. Дарэчы, калі нашы прапановы па «бязвізе» будуць падтрыманыя, я думаю, фестываль збярэ яшчэ нашмат больш гасцей. Ужо ёсць яго канцэпцыя, мы вызначыліся, якія аб'екты, задзейнічаныя ў свяце, трэба пабудаваць, рэстаўраваць, адрамантаваць, думаем, як зручна размясціць удзельнікаў, гасцей і шматлікіх турыстаў, якія, несумненна, прыбудуць у гэтыя дні ў Гродна, дзе і чым іх накарміць, як, не ствараўшы нязручнасцяў, гарантаваць бяспеку. Пастаянныя ўдзельнікі фестывалю кожны раз знаходзяць Гродна больш прыгожым і ўтульным, чым мінулы раз. І зараз прыкладаецца шмат намаганняў, якія павінны ўвасобіцца ў канкрэтны вынік — яркае, запамінальнае свята.

***— Уладзімір Васілевіч, як і кожны кіраўнік мясцовай улады, Вы нярэдка праводзіце прамыя тэлефонныя лініі і прыёмы грамадзян. Што вас падчас размоў з людзьмі найбольш уражвае не як губернатара — як чалавека?***

— Уразіць мяне вельмі складана, я за гады работы з людзьмі шмат чаго бачыў... Але дагэтуль уражвае і па-добраму здзіўляе, калі людзі прыходзяць не з асабістай просьбай, а з нейкай грамадскай ініцыятывай, калі людзям не абыякавы лёс і развіццё месца, дзе яны жывуць, калі яны прыходзяць з цікавымі прапановамі, як палепшыць жыццё, як добраўпарадкаваць, захаваць тое, што маем.

**Пытанні задавалі Алена ЛЯЎКОВІЧ, Павел СУХАРУКАЎ.**

■ Ураджай-2017

# СМАК І ЗАБАВЫ КІРМАШУ

## У Свіслачы прайшоў абласны фестываль «Дажынкі»



**Наведвальнікі свята прайшліся па падворках, дзе ўсе раёны Гродзенскай вобласці прадэманстравалі свае кулінарныя далікатэсы.**



Фота БЕЛТА.





Напрыклад, з Ваўкавыска прывезлі вырабы з казінага малака. Тут знаходзіцца самая буйная ў краіне казіная ферма. На гродзенскім падворку частавалі пончыкамі і хлебам сваёй выпечкі, ды яшчэ і з маслам. А таксама прадэманстравалі шлях хлеба ад млына да печы. Гаспадары фестывалю сустракалі гасцей салам і чаркай сапраўднай белавежскай настойкі. Бульбяныя далікатэсы прапанавалі на астравецкім падворку. Тут можна было падсілкавацца дранікамі з мачанкай, цэпелінамі і бульбянымі пірагамі. А таксама пагглядзець фотавыстаўку аб зборы «другога хлеба» беларусаў. Смаргонь здаўна славіцца сваімі абаранкамі. Іх тут выпякаюць на асаблівым рэцэпце. А як правільна ўжываць, расказалі гасцям фестывалю самі кулінары на сваім святочным падворку. На іўеўскі падворак завезлі вырабы з памідораў. Добрым попытам карысталіся аджыка і леча розных гатункаў. На карэліцкім частавалі фірменнымі беляшамі і рыбай, фаршыраванай грыбамі і агароднінай. Сам падворак быў абсталяваны пад сялянскі падвал, дзе захоўваюцца прыпасы на зіму — яблыкі, бульба, капуста, розныя марынады і саленні. З Дзятлава прывезлі фірменныя сыры і мёд, а з Воранава — сальтысон і пірагі з курыцай. На мастоўскім падворку можна было пакаштаваць сапраўдную медавуху ў імправізаванай карчме, а на шчучынскім — грыбны суп, які варылі тут жа.

З Бераставіцы прывезлі басейн, які зарыбілі карпам і карасём. Усе, хто пажадаў, мог злавіць рыбу і пайсці са сваім уловам.

Акрамя разнастайнай кухні, усе раёны прывезлі на фестываль у Свіслач свае святочныя караваі, выпечаныя з мукі новага ўраджаю. Усе вырабы без перабольшання можна назваць мастацкімі творамі і няват музейнымі экспанатамі. На адным «расцвіталі» сланечнікі, на другім — ружы, на іншых — рамонкі, валошкі, каласкі. Самым высокім аказаўся пяціярусны каравай, які выпяклі ў Ваўкавыску. Найлепшым яго прызналі самі наведвальнікі, якія галасавалі... абаранкамі. Па іх колькасці і вызначаўся пераможца.

Кожны раён прывёз на «Дажынкі» не толькі сваю кулінарную «фішку», але і адмысловую праграму. Былі тут і роставыя лялькі з Дзятлава, і віртуозы-гарманісты з Воранава, і рыцары з Ліды. Наведвальнікі маглі зрабіць падарожжа на «Свяце дуба» ці схадзіць на «Сяброўскі фэст». Агульную ўвагу прыцягнуў белавежскі падворак, куды запрашаў гасцей сам Дзед Мароз. Добры настрой падмацоўвалі яскравыя нумары святочнага канцэрта ў розных кутках вялікай фестывальнай пляцоўкі.

Асаблівым момантам свята стала адкрыццё памятнага знака ў выглядзе шпіля. Яшчэ ў XVIII стагоддзі ў мястэчку Свіслач такі ж беласнежны чатырохгранны стоўб, увенчаны пазалачоным шарам і шпілем, быў устаноўлены графам Тышкевічам. Цяпер былы сімвал горада зноў устаноўлены на тым жа месцы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

*margo@zviazda.by*


**ОАО «Гомельоблреклама», филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 6 декабря 2017 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 80% по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС (20%) | Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС (20%) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль ГАЗ-2705-410**, инв. №51317, 2002 года выпуска, **рег. №ЕВ 6993**, тип ТС – грузовой специальный фургон, цвет – синий с белой полосой, объем двигателя – 2,0 л, бензин, состояние – неудовлетворительное. Местонахождение: **г. Рогачев, ул. Ленина, 49А** | 237,87 | 23,79 |
| 2 | **Автомобиль ГАЗ 2705-410**, инв. №504010021, 2008 года выпуска, **рег. №АЕ 7380-3**, тип ТС – грузопассажирский вагон, цвет – бледно-красный, бензин, состояние – удовлетворительное. Местонахождение: **г. п. Октябрьский, ул. Дзержинского, 45** | 480,66 | 48,07 |
| 3 | **Автомобиль УАЗ-39099-4**, инв. №504010023, 2007 года выпуска, **рег. №АВ 3103-3**, тип ТС – грузопассажирский фургон, цвет – голубой, состояние – неудовлетворительное. Местонахождение: **г. Чечерск, ул. Советская, 17** | 238,81 | 23,88 |

**Продавец:** РУП «Белпочта» Гомельский филиал, г. Гомель, ул. Советская, 8. Конт. тел. 8 (0232) 79-68-24 – Старовойтов С. В. (ведущий инженер ГМТО).
**Шаг аукционных торгов – 5%. Для участия в аукционе необходимо:**
**1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (РУП «Белпочта» Гомельский филиал):** Р/с BY 35AKBB30120210200543100000 в ЦБУ №305 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21302,УНП 400395996, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления);
**2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 21 ноября 2017 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 4 декабря 2017г. в 16.00.**
**Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** торгов в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в течение **5 (пяти) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Подробное извещение опубликовано в газете «Белорусская нива» («Сельская газета») №64 (20896) от 08.06.2017 г. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232)23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы».**